Источник: "Рэспубліка" - 2014-10-07

# На той далёкай, на імперыялістычнай

«На імперыялістычнай вайне» — такую назву мае кніга ўдзельніка вайны Максіма Гарэцкага, якая пабачыла свет у 2014 годзе ў выдавецкім доме «Беларуская навука». Прэзентацыя выдання адбудзецца сёння ў інфармацыйна-выставачным цэнтры Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН у рамках Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Першая сусветная вайна ў народнай памяці і мастацкім адлюстраванні». У гэтым форуме прымаюць удзел вучоныя з Беларусі, Вялікабрытаніі, ЗША, Польшчы, Расіі і іншых краін, кіраўнікі дыпламатычных місій краін — удзельніц вайны, літаратуразнаўцы, мовазнаўцы і культуролагі, пісьменнікі і выдаўцы.




Грамадскасць краіны адзначае ў гэтым годзе сотую гадавіну з пачатку Першай сусветнай вайны, якая прынесла нашаму народу незлічоныя людскія страты, гора і пакуты. Сотні тысяч працаздольных беларусаў вымушаны былі зведаць гаротную долю бежанцаў. Многія з іх так і не вярнуліся на роднае котлішча. Тэме вайны, чалавека на вайне, гераізму і мужнасці салдат прысвечана нямала твораў рускай і еўрапейскай літаратуры. Сваё адметнае слова пра гэтую трагічную падзею сказалі і беларускія паэты і празаікі, у тым ліку і Максім Гарэцкі, аўтар выдатнага дакументальна-мастацкага твора «На імперыялістычнай вайне» з адметным выразным падзагалоўкам «Запіскі салдата 2-й батарэі N-скай артылерыйскай брыгады Лявона Задумы».

«Запіскі салдата...» Максіма Гарэцкага можна разглядаць як надзейную крыніцу вывучэння гісторыі вайны 1914 — 1918 гадоў. Асоба аўтара, яго талент мастака-гуманіста, які нязменна арыентуецца на жыццёвую праўду, служаць гарантамі суровай праўды, адлюстраванай у мастацкім творы.

У імпрэзе прымуць удзел укладальнік выдання — кандыдат філалагічных навук Тэрэза Голуб, навуковы рэдактар — член-карэспандэнт НАН Міхась Мушынскі, акадэмік Радзім Гарэцкі, іншыя навукоўцы і знаўцы беларускай літаратуры.

З нагоды правядзення міжнароднай навуковай канферэнцыі Цэнтральнай навуковай бібліятэкай НАН падрыхтавана выстава «Першая сусветная вайна — гістарычны час на старонках літаратуры». Арганізатары яе звярнуліся да мастацкіх твораў М. Гарэцкага, К. Крапівы, Я. Купалы, Я. Коласа, А. Гаруна і іншых, хронік, успамінаў і мемуараў сучаснікаў Першай сусветнай вайны.

**Дзмітрый МАХОТКІН**

Дзмітрый Махоткін. На той далёкай, на імперыялістычнай